■ Абмяркуем?

# «І НА МАШЫННЫМ ДВАРЫ ЦЯПЕР ЦІХА»

**...Кажаце, вёска сёння не тая? Кажаце, яна састарэла, адны пенсіянеры там? Але ж гадоў дваццаць і болей таму іх было не менш. Проста ў вочы не кідаліся, бо старыя былі сярод маладзейшых, якія тады працавалі ў калгасе, гадавалі дзяцей.**



І ўсім жа было добра. Ні бедных табе, ні багатых; усе, чым могуць, дапамагаюць адно аднаму. Раніцай сонейка ўзыдзе — на машынным двары чуюцца галасы, лапочуць трактары ды машыны. Яшчэ і гэты шум падказваў, што дарослым трэба на працу, дзецям — у школу. Вёска не гуляла, усе — ад малога да старога — былі пры справах.

Сёння ўсё па-іншаму. Ці-шы-ня. Пройдзе нехта па вуліцы, дык хутчэй бяжыш да акна — трэба ж паглядзець, хто там пайшоў. А выйдзеш з хаты сам, дык сустрэнеш хіба некага ў магазіне альбо ля аўтакрамы, якая пад'язджае амаль да брамкі, толькі б нешта прадаць.

На машынным двары цяпер ціха таксама. Аб'яднаці дзве гаспадаркі, таму цэнтр сёння за сорак кіламетраў. Уся тэхніка — там, на брыгадзе — толькі ў пасяўную або ў час уборкі. Хіба на ферме яшчэ пару трактароў працуе...

Калі спытаеце, ці ёсць у нашай вёсцы маладыя, адкажу: ёсць. І беспрацоўныя таксама ёсць, як і ў іншых месцах. Работу, заробак шукаюць хто дзе можа, часам за 10-15 кіламетраў, а то і далей...

Жанчын, якім, апроч гэтага, патрэбен стаж для налічэння пенсій, таксама нямала. Яны, бывае, знаходзяць работу няхай і далекавата ад дому, але ж такую, каб працаваць там суткі праз двое. Бо ў кожнай свая сям'я, дом. Трэба ж і есці наварыць, і ў хаце парадак навесці. Ды і без гаспадаркі цяпер ніяк, асабліва калі растуць дзеці, калі іх трэба вучыць.

Школу ў нас з-за адсутнасці вучняў закрылі. Будынак прадалі прадпрымальніку. Той стварыў два працоўныя месцы, але заробкі, кажуць, былі малыя, і людзі звольніліся.

У садку таксама мала дзяцей. Ведама ж — пенсіянеры іх не народзяць. Ды і маладзейшыя сёння не вельмі адважваюцца...

Кажуць, нам, пенсіянерам, грэх скардзіцца на жыццё... Можа быць. Здаравейшыя альбо хворыя, мы стараемся нечым заняць сябе. Летам пасільных работ хапае, а вось зімой у вёсцы — хоць ты воўкам вый! Калі суткамі глядзець тэлевізар, здурнееш. Ды яшчэ адзінота, ад якой да часу старэеш...

Шчасце, што працуе царква. Хоць па святах ды нядзелях ёсць магчымасць выйсці ў людзі; шчасце, што прыходзіць газета — можна пачытаць.

І напісала вось, расказала пра наша вясковае жыццё-быццё — і неяк палягчэла.

Пабудаваць бы ў былых гаспадарках якія свінакомплексы ці птушкафабрыкі, адкрыць бы, хай малыя, але прадпрыемствы — бо найперш жа людзям патрэбна праца. Глядзіш, і заставалася б на зямлі моладзь, жыла б нармальным сялянскім жыццём, не горшым за гарадское... Мне здаецца, вёска не вымерла — яе на нейкі час нібыта ўсыпілі. Ці я памыляюся?

**Лідзія ЛУК'ЯНАВА,** *в. Швабы, Лагойскі раён.*

**Замест пасляслоўя.** *Як спяваў калісьці Марк Бернэс, «Я вам не скажу за всю Одессу...». А таму, жывучы ў адной вёсцы, нельга казаць «за ўсе»...*

*Калі ёсць жаданне і час, напішыце, як і чым жыве сёння ваша вёсачка, хутар, мястэчка, аграгарадок, засценак... Якія ў іх перспектывы? Ці пачнецца калі «зваротны рух» — з гарадоў у вёскі? Што для гэтага трэба?*

■

■ Кватэрнае пытанне

# КАМЕРЦЫЙНАЕ ЦІ САЦЫЯЛЬНАЕ?

***Я адзінокая непрацуючая пенсіянерка, інвалід з дзяцінства. У 1991 годзе атрымала аднапакаёвую дзяржаўную кватэру... У хуткім часе завершыцца прыватызацыя дзяржаўнага жылля. Ці можна будзе пасля гэтага пераведці маю непрыватызаваную аднапакаёўку ў разрад жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання?***

**А.П.,** *г. Браслаў.*

Згодна з падп. 2.4 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16.12.2013 г. № 563 «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін» непрыватызаваныя жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду да 1 ліпеня 2016 г. падлягаюць уключэнню ў вызначаным парадку ў склад жылых памяшканняў *камерцыйнага* выкарыстання.

Разам з тым, у адпаведнасці з п. 91 Палажэння аб уліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і аб парадку прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 снежня 2013 года № 563) па заяве наймальнікаў жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання, якія адносяцца да асоб, вызначаных у п. 63 гэтага Палажэння, жылыя памяшканні камерцыйнага выкарыстання, якія яны займаюць, падлягаюць уключэнню ў склад жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання.

Паводле п. 63 названага палажэння права на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання маюць пэўныя катэгорыі грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, у тым ліку і непрацуючыя адзінокія пенсіянеры, асобы, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту (жанчыны — 55 гадоў, мужчыны — 60 гадоў).

Пад *непрацуючымі адзінокімі* разумеюцца грамадзяне, якія не ажыццяўляюць працоўную дзейнасць на падставе працоўных дагавораў, грамадзянска-прававых дагавораў, прадметам якіх з'яўляюцца выкананне работ, аказанне паслуг і стварэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, і прадпрымальніцкую дзейнасць, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, што абавязаны па законе іх утрымліваць і пражываюць сумесна або ў адным населеным пункце.

Інваліды з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з наступствамі ваенных дзеянняў, а таксама грамадзяне, у складзе сем'яў якіх ёсць дзеці-інваліды, таксама маюць права на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання.

**Віктар САВІЦКІ**

■

■ Ведай нашых!

# «КАЛІ ТЫ ДА ЛЮДЗЕЙ З ДАБРОМ...»

**З юбілейным, сотым (!) днём нараджэння Ганну Антонаўну Выгоўскую віншавалі многія: родныя, сябры, суседзі, старшыні раённых саветаў ветэранаў, аб'яднання прафсаюзаў, саюза жанчын... Цэлы пакой яны заставілі кветкамі і каштоўнымі падарункамі, шмат напісалі і сказалі прыгожых удзячных слоў! І, натуральна, у яе, такой шаноўнай юбіляркі, хацелі выпытаць сакрэт даўгалецця.**

— А яго няма, — шчыра прызналася жанчына. — Я ніколі нікому не зайздросціла, шмат працавала і рухалася. А каб не падала, само жыццё досыць часта сцябала мяне па спіне... Багата было палос — і чорных, і белых.

Бацька юбіляркі Антон Георгіевіч Бяганскі — з вёскі Баравы Мост, з сялян, праўда, пры цары скончыў пачатковую школу. Гэта ён навучыў малую Ганначку чытаць, пісаць, рашаць задачы (маці была непісьменнай). Потым малую аддалі ў Беразіно ў школу. Там яна вучыла беларускую, польскую і рускую мовы, усе астатнія прадметы выкладаліся на польскай.

Сам горад, як прыгадвае Ганна Антонаўна, на той час быў вельмі ўбогім: брудныя вуліцы (Папоўшчына, Ігуменская, Жорнаўская...), бальніча на 10 ложкаў, пошта ды невялікі спіртзавод. Была, праўда, прыстань. Па рацэ Бярэзіне хадзілі параходы ў Барысаў, адтуль па чыгунцы людзі дабіраліся ў Мінск.

Дзяўчынка гэта ведала, як і тое, кім стане. «Толькі настаўніцай, — сцвярджала яна, — такой, як яе любімая Ханка Дамброўска!»

А таму далей у яе біяграфіі быў Мінск, педагагічны тэхнікум і першае накіраванне на працу.

У Чавускім раёне школы тады былі розныя: беларуская, руская, яўрэйская, літоўская, польская. Якраз у такой — Лапенскай пачатковай — Ганна Антонаўна стала загадчыцай.

Пры школе была свая кватэрка. 40 вучняў, іх бацькі... Сціпласць і прыветнасць маладой настаўніцы прыйшліся даспадобы ўсім. А найбольш — прыбіральшчыцы Анэлі Іванаўне Выгоўскай, якая, што называецца, спала і бачыла дзяўчыну сваёй нявесткай, бо сын — без пяці хвілін афіцэр, выпускнік Калінінскага ваеннага вучылішча — вось-вось павінен быў прыехаць дамоў на пабыўку...

Так яно ўрэшце і сталася. А далей...

— Мы з Эрнестам на вечарынцы пазнаёміліся і толькі адзін танец станцавалі, — святлеючы тварам, успамінае Ганна Антонаўна. — Ён мне вельмі спадабаўся! Я яму, казаў, таксама. Так што назаўтра ён зайшоў да мяне ў школу і прапанаваў пайсці ў сельсавет распісацца. Параіцца мне не было з кім, я падумала і згадзілася. Так мы з Эрыкам сталі мужам і жонкай, але на паперы. Не было ні месца, ні часу, каб хоць нагледзецца адно на аднаго, каб пабыць сам-насам. Гэта ж цяпер без усялякага сораму хлопцы з дзяўчатамі «распісваюцца» спачатку ў пасцелі, гуляюць у шлюб, як у кубік Рубіка — супадзе не супадзе, а некалі — не... Назаўтра майму Эрыку трэба было ехаць на службу на Далёкі Усход.

Адтуль ён даслаў бацькам сваёй жонкі падзячны ліст за дачку, а ёй самой — пропуск у часць, і яна, прыхапіўшы з сабой самае неабходнае, паехала да мужа.

...Лёсавызначальны выпадак — інакш не скажаш: у Маскве на вакзале ёй і яе, так бы мовіць, суседзі па чарзе не хапіла білетаў на цягнік! А назаўтра, ля той самай касы яны пачулі жахлівую навіну: цягнік, які паехаў без іх, сышоў з рэек, пасажыры загінулі.



Ужо іншым цягнікам, праз 11 сутак Ганна ўсё ж дабралася да месца службы мужа. Усурыйскі край... Вайсковыя казармы сярод стэпу і сопак. Бязлюддзе. Гарачыя вятры...

Там у 1937-м нарадзіўся іх першынец, таксама Эрнест. І ў тым жа 37-м, праз тры месяцы, у іх кватэры з'явіўся следчы з НКУС, каб... арыштаваць яе мужа як шпіёна.

Ад нечаканасці і адчаю Ганна Антонаўна, як прызнаецца, ледзь не звяла рахункі з жыццём. Спыніла немаўля («Каму яно будзе патрэбна?» — з жахам падумала маці)... А яшчэ – людзі. Гэта яны сабралі грошай для жонкі «ворага народа», купілі ёй білет да Мінска.

Такім чынам Ганна зноў прыехала ў Чавускі раён: настаўнічала ў Благавіцкай сярэдняй школе, гадавала сына, чакала мужа. І цуд такі здарыўся: яго рэабілітавалі, аднавілі ў вайсковай часці, прысвоілі званне старшага лейтэнанта, далі водпуск...

Пасля адпачынку яго далейшая служба праходзіла ў Арле, потым — у Брэсце. Як нітачка за іголачкай за мужам рухалася сям'я. Эрыку-малодшаму было 4 гадкі, калі ў яго нарадзіўся брацік Анатоль.

Але пажыць да парадавацца бацькам зноўку не выпала: наступіла новая чорная паласа — вайна. Брэст гарэў ад бамбёжак нямецкіх самалётаў. Ганне з дзеткамі неяк удалося дамовіцца з праваднікам санітарнага цягніка і даехаць да Мінска.

— У горадзе мы з малымі хадзілі па людзях, пабіраліся, прасілі, каб нехта даў бульбіну, кавалачак хлеба, каб пусціў пераначаваць, — прыгадвае Ганна Антонаўна. — Толькі праз два месяцы мне пашчасціла сустрэць знаёмага, які дапамог дабрацца да родных мясцін, да матулі. А бацькі ўжо не было. У тым самым 37-м яго, без віны вінаватага, арыштавалі і расстралялі ў Вобчым Логу каля Чэрвеня.

У выніку (рэпрэсіі, фронт, партызаны) мужчын у акрузе амаль не стала. Жанчыны на сабе цягалі плугі ды бароны — аралі, сеялі, убіралі ўраджай. Тыл для іх быў не лягчэйшым, чым фронт для мужчын. Працавалі ад золку і да змяркання. Стома, успамінае Ганна Антонаўна, валіла з ног, але і сны яна часам бачыла. У іх найчасцей яна была шчаслівай нявестай побач з мужам-афіцэрам... Але часам ён сыходзіў ад яе, аддаляўся і ўсё махаў і махаў рукой...

Эрнест Выгоўскі, намеснік начальніка палкавой службы, праз 4 месяцы пасля пачатку вайны загінуў у баях на Ленінградскім фронце.

...У пасляваенны час жанчынудоў у Беларусі было вельмі шмат. На шчасце, Ганна Антонаўна мела істотную перавагу: прафесію і месца працы — спачатку ў Вяшэўскай пачатковай школе, затым у Лясковіцкай васьмігодцы.

Трэба адзначыць, што пакаленне шаноўнай юбіляркі жыло па самых высокіх мерках маралі. А настаўніка і наогул лічылі эталонам.

— Калі ты да людзей з дабром, то яны да цябе таксама, — кажа Ганна Антонаўна. І прызнаецца, што менавіта павага і падтрымка людзей, іх дабрыня дапамаглі ёй перажыць боль ад страты абодвух сыноў...

— З усіх маіх мінулых багаццяў усё, што засталася, — гэта ўнукі, вучні ды памяць, — з усмешкай гаворыць настаўніца.

А я з вялікім гонарам дадала б: і незвычайная душэўная прыгажосць.

**Ніна БУРКО,** *г. Беразіно.*

***Ад рэдакцыі. Як сведчыць зваротная сувязь, невялічкая нататка «Братоў было трое», змешчаная ў «Звяздзе» 24 мая, дазволіла нашым падпісчыкам, сваякам загінулых у вайну братоў Куродымаў, адшукаць новую радню...***

***Добра будзе, калі і гэты невялікі артыкул нагадае вучням пра іх былую настаўніцу. Яна, стагадовая, помніць іх. Яны, напэўна, таксама...***

*Пошту чытала рэдактар аддзела пісьмаў Валянціна ДОЎНАР.*